наведванне навукова-практычных канферэнцый, заняткаў па павышэнні кваліфікацыі супрацоўнікаў гэтых цэнтраў і ў іншых формах.

У метадычным аспекце найбольш актуальнымі з'яўляюцца: 1) распрацоўка лабараторных заняткаў, спецкурсаў і курсаў на выбар, арыентаваных на засваенне аўтаматызаванай тэхналогіі пошуку сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі, напрыклад, у аўтаматызаваных базах даных прававой і бізнес-інфармацыі; 2) камплектаванне вучэбных лабараторый і бібліятэкі БУК метадычнымі парадамі для карыстальнікаў баз даных; 3) перавыданне метадычных матэрыялаў па методыцы бібліяграфічнага пошуку сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі для студэнтаў-завочнікаў у выглядзе метадычных указанняў для самастойнай работы, зборнікаў наглядных дапаможнікаў, тэкстаў лекцый; 4) мэтанакіраванае выкарыстанне ў працэсе навучання галіновых рубрыкатараў і класіфікацый дакументных носьбітаў сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі, у т.л. выкарыстоўваемых у міжнародных інфармацыйных сетках, у прыватнасці, класіфікатараў нарматыўных актаў, рубрыкатара ЮНЕСКА, класіфікацыі Дзьюі і іншых.

*Дзямешка Л.А., прафесар*

## АСАБІСТЫЯ ЯКАСЦІ ВЫКЛАДЧЫКА І ІХ УПЛЫЎ НА СТУДЭНТАЎ ФЗН

Студэнты факультэта завочнага навучання БІС уяўляюць у асноўным працуючых бібліятэкараў, маладых дзяўчат і жанчын, якія павышаюць свой адукацыйны статус. Многія з іх прыйшлі атрымаць вышэйшую адукацыю пасля заканчэння Магілёўскага бібліятэчнага тэхнікума, маюць сем'і, пэўны багаж прафесійных ведаў і стаж працоўнай дзейнасці. Вядома, такі кантынгент студэнтаў патрабуе ад выкладчыкаў ФБІС высокага прафесіяналізму і пэўных асабістых якасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У вучэбным працэсе кожны выкладчык ставіць мэту даць студэнтам веды, развіваць іх творчыя здольнасці, якія ўжо выявіліся ў працы, фарміраваць уменні, навыкі. Асаблівасцю навучання з'яўляецца тая акалічнасць, што веды выступаюць у выглядзе асобай змястоўнай вучэбнай інфармацыі. Уменні ў педагагічных крыніцах вызначаюцца як магчымасць эфектыўна выконваць дзеянні ў адпаведнасці з умовамі, у якіх даводзіцца працаваць; як веды ў дзеянні; як здольнасць выконваць работу ў новых умовах. Навыкі вызначаюцца як гатоўнасць чалавека дасягнуць мэты (у працоўнай дзейнасці) без строгага кантролю з боку мыслення. Інакш кажучы, гэта дзеянні, якія характарызуюцца высокай мерай засваення; дзеянні, якія становяцца аўтаматызаванымі. У практычнай дзейнасці ўменні перарастаюць у навыкі. Расійскі педагог М.А.Давыдаў лічыць, што ўменні - гэта веды ў дзеянні, а навыкі - дзеянне, асобныя кампаненты якога ў выніку практыкавання сталі аўтаматызаванымі.

Такім чынам, уменні і навыкі цесна ўзаемазвязаны, з'яўляюцца звёнамі аднаго ланцужка, які ўздзейнічае на развіццё творчых здольнасцей асобы завочніка. Можна адзначыць, што ўсё гэта – адзінства актуалізаванага зместу навучання, на базе якога ўзаемадзейнічаюць педагог і студэнт-завочнік.

Сфера навучання студэнтаў уяўляе перш за ўсё актыўны міжасобасны ўзаемаабмен, камунікацыю, дзе і выкладчык, і студэнт-завочнік валодаюць не толькі "прасторай стасункаў", але і дакладна вызначаным полем прыцягнення або адштурхоўвання. Якую ролю тут выконваюць асабістыя і характаралагічныя якасці выкладчыка? Ці можна разглядаць іх як своеасаблівыя састаўныя часткі прафесійнай дзейнасці выкладчыка, як важнейшыя ўмовы станоўчага або адмоўнага балансу?

Сучаснае чалавеказнаўства станоўча адказвае на гэтае пытанне. Зыходзячы з тэорыі "Я – канцэпцыі", распрацаванай англійскім псіхолагам і педагогам Р.Бёрнсам, можна сцвярджаць наступнае: чым больш пазітыўнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з'яўляецца самаацэнка выкладчыка, тым большая верагоднасць таго, што ён здолее выхаваць у студэнта стыль творчага навучання, заснаваны на самастойнасці мыслення, а не механічным завучванні асобных фактаў і палажэнняў.

З другога боку, чым менш педагог упэўнены ў сабе, тым больш ён схільны да стэрэатыпнага, фармальнага мыслення і адпаведна дагматычнага стылю выкладання. У выніку выкладанне зводзіцца да прымітыўных форм, якія не дазваляюць дыскусій, варыянтнага выбару і альтэрнатыў у працэсе навучання.

Прафесар Калумбійскага універсітэта М.Грын лічыць, што педагог уплывае на развіццё здольнасцей асобы, што студэнтам імпануюць выкладчыкі, якія ўносяць асабісты вопыт і эмацыянальную афарбоўку ў выкладанне дысцыпліны, паўсядзённыя стасункі. Выкладчык павінен быць камунікатыўным. Гэтая рыса прадугледжвае гуманізацыю выкладання, што ў сваю чаргу садзейнічае самарэалізацыі асобы. Кампетэнтнасць педагога, паводле сцвярджэння брытанскіх псіхолагаў і педагогаў Д.Фантана, Б.Розенштайна, амерыканскага псіхолага Д.Раянса, усё ж не можа кампенсаваць яго асабістых недахопаў у вачах студэнтаў.

Практыка пацвярждае гэтыя высновы. Высокакваліфікаваныя педагогі, якія цудоўна валодаюць методыкай выкладання дысцыпліны, але маюць негатыўныя асабістыя якасці, у вачах студэнтаў набываюць імідж злоснага, прыдзірлівага, неаб'ектыўнага чалавека. Гэты імідж адмоўна ўздзейнічае на розныя пакаленні студэнтаў, нараджае страх перад экзаменамі, страту веры ў сябе. Адмоўныя характаралагічныя якасці педагога падрываюць маральныя ўстоі студэнта, змяншаюць жаданне вучыцца, часта вядуць да стрэсавых сітуацый, перакрэсліваюць творчыя сілы і магчымасці навучэнца, адмоўна ўплываюць на яго самапавагу.

Узнікаюць пытанні: якім чынам вызначыць падобныя адмоўныя асабістыя якасці выкладчыка? Як з імі змагацца? Дарэчы, у чыстым выглядзе яны сустракаюцца рэдка. У той жа час паглядзець на сябе з боку педагогу бывае вельмі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цяжка. У сучаснай замежнай педагагічнай літаратуры ідзе абмеркаванне двух накірункаў у педагогіцы. Так, амерыканскі вучоны К.Роджэрс даследаваў адзін з істотных механізмаў развіцця асобы. Ён высветліў, што толькі ў атмасферы станоўчых адносін да сябе з боку аўтарытэтнага чалавека пацыенты пачыналі прызнаваць свае недахопы і самастойна знаходзіць спосабы прагрэсіўнага перайначвання сябе.

Калі педагог перастае быць аўтарытарным "інструктарам", ён бярэ на сябе місію нефармальнага навучання. Тады прыярытэт аддаецца эмацыянальнаму характару выкладання, які вызначае мэту навучання, яго змест, методыку і г.д. Адпаведна фарміруюцца адносіны паміж педагогамі і студэнтамі: выкладчык становіцца натуральным у сваіх праяўленнях, не носіць рытуальнай маскі. Студэнт у такім выпадку можа свабодна выяўляць сваю індывідуальнасць, выказваць меркаванні і погляды, быць адкрытым, у яго знікае страх перад педагогам.

Іншая справа, калі выкладчык з'яўляецца аўтарытарнай асобай, якой уласцівы набор пэўных установак. Сярод такіх негатыўных установак можна вылучыць найбольш характэрныя: адмоўная рэакцыя на тых студэнтаў, якія не любяць выкладчыка; выкарыстоўванне любой магчымасці для стварэння студэнтам цяжкасцей, бо гэта быццам бы не дае ім "расслабляцца"; выкліканне ў студэнта пачуцця віны за нейкія хібы ці недапрацоўкі; імкненне да ўсталявання жорсткай субардынацыі, трыманне студэнта на вялікай дыстанцыі; разгляд нават аргументаваных пропускаў у якасці галоўнага фактару пры здачы экзамену; абыякавыя адносіны да поспехаў студэнтаў, іх асабістага жыцця і іх недахопаў; схільнасць да насмешкі з іншых людзей, тым больш з калег, ці негатыўныя водгукі пра іх у прысутнасці студэнтаў.

Педагог з такімі ўстаноўкамі згубна ўплывае на асобу студэнта, стварае негатыўны эфект, садзейнічае развіццю такіх адмоўных рыс, як угодлівасць, ліслівасць, страх, няўпэўненасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На наш погляд, для эфектыўнай работы са студэнтамі-завочнікамі выкладчык павінен валодаць наступнымі якасцямі: імкненнем да максімальнай дакладнасці ў выкладанні сваёй дысцыпліны з прымяненнем самых розных методык адпаведна пэўнай студэнцкай аудыторыі – з базавай прафесійнай падрыхтоўкай (тэхнікум), са стажам работы і г.д.; здольнасцю да эмпатыі (разумення сямейнага становішча студэнта-завочніка, яго пачуццяў, гатоўнасці да спачування, павагі да асобы студэнта, сімпатыі); уменнем надаць выкладу матэрыялу асабістую і прывабную афарбоўку; уменнем усталяваць нефармальныя цёплыя стасункі са студэнтамі; эмацыянальнай ураўнаважанасцю; упэўненасцю ў сабе, жыццялюбствам; уменнямі ацаніць сітуацыю, з дапамогай гумару, добразычлівага жарту змяніць атмасферу, пазбегнуць непрыемных інцыдэнтаў.

Гэтыя асабістыя якасці і ўстаноўкі надаюць характэрную афарбоўку прафесійнай кампетэнтнасці педагога, а ў выніку станоўча ўплываюць на развіццё ўменняў, навыкаў і творчых здольнасцей студэнтаў-завочнікаў.

*Дуркіна Г.Р., ст. выкладчык*

## РОЛЯ СПЕЦКУРСА ПА ЛІТАРАТУРЫ Ў РАЗВІЦЦІ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ, НАВЫКАЎ І ЎМЕННЯЎ СТУДЭНТАЎ

Наступнае, XXI стагоддзе павінна стаць стагоддзем гуманітарным, стагоддзем высокай ацэнкі чалавечых каштоўнасцей. Вялікая роля ў гэтым належыць гуманітарным навукам, якія вызначаюць агульную інтэлігентнасць чалавека. Асобае месца ў гуманітарнай адукацыі мае сусветная літаратура.

У сувязі з пашырэннем культурнага руху ў нашай краіне, неабходнасцю паглыблення ведаў актуальнасць набывае пытанне аб удасканаленні сістэмы выкладання



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ